***Н. І. Гуд,***
*старшы выкладчык кафедры*
*педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# СУЧАСНЫЯ МАСТАЦКА-СПАРТЫЎНЫЯ СВЯТЫ НА БЕЛАРУСІ

Мастацка-спартыўныя святы на Беларусі маюць багатую гісторыю і фарміраваліся ў некалькі этапаў, і ў выніку ўвабралі ў сябе прыгажосць спорту, мастацтва і сталі сапраўднымі культурнымі падзеямі.

Вельмі важна звярнуць увагу на класіфікацыю гэтага жанра мастацтва. Прааналізаваўшы шмат святаў, вылучана дзве групы (па тэматыцы і па месцы правядзення). У сваю чаргу групы падзяляюцца на класы.

Група 1:

а) спартыўна-гістарычныя святы;
б) спартыўна-народныя святы;
в) спартыўна-фізкультурныя святы;
г) спартыўна-ваенныя святы.

Група 2:

а) спартыўнае свята на плошчы;
б) спартыўнае свята на стадыёне;
в) спартыўнае свята на вадзе;
г) спартыўнае свята ў парку культуры і адпачынку;
д) спартыўнае свята ў палацах спорту і культуры.

Пры падрабязным аналізе ўвага надаецца спецыфічным рысам, якія адрозніваюць класы паміж сабой. Нягледзячы на тое, што структура мае агульныя рысы, сутнасць застаецца рознай. Таму разглядаць структуру важна на дакладным прыкладзе, які адлюстроўвае спецыфіку свята. Напрыклад: свята на стадыёне, на вадзе і спартыўна-гістарычнае свята паводле класіфікацыі. Менавіта яны маюць вельмі вялікія адрозненні ад іншых, таму ім нададзена асаблівае значэнне. Стадыён мае складаную пабудову мізансцэн і вялікія магчымасці. Таксама і спартыўна-гістарычнае свята мае складаную пабудову, бо трэба аднаўляць важныя падзеі мінулага, што вельмі складана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак ніводнае свята не абыходзіцца без актывізацыі ўдзельнікаў, у аснове якой ляжаць гульнявыя дзеянні, забавы, эстафеты і розныя сучасныя спаборніцтвы для кожнага жадаючага. Калі людзі не толькі прысутнічаюць на свяце, але і ўдзельнічаюць у мерапрыемствы, то для іх гэта становіцца падзеяй. Змест і задачы гульнявых дзеянняў павінны быць простымі і не патрабаваць спецыяльнай падрыхтоўкі. Спартыўна-гульнявыя дзеянні павінны быць распрацаваны так, каб людзі розных узроставых катэгорый і сацыяльнага статусу маглі ў іх удзельнічаць і прадэманстраваць сваё майстэрства. Пляцоўку варта падзяліць на зоны па інтарэсах: відовішчную, масава-гульнявую, спартыўную і дзіцячую.

Дашкольным установам адукацыі трэба звярнуць увагу на дзіцячыя спартыўныя гульні як фактар усебаковага фарміравання і развіцця асобы.

Школьным установам адукацыі варта праводзіць спартландыі, дні здароўя, спаборніцтвы на аснове прагрэсіўных спартыўна-гістарычных традыцый нашых продкаў для фарміравання фізічнай сілы і патрыятызму.

Вышэйшым навучальным установам неабходна замацоўваць веды аб развіцці спорту, а таксама ўдасканальваць методыку выкладання фізічнай культуры на базе беларускіх спартыўных традыцый.

Гарадскім, раённым, сельскім дамам культуры, а таксама сельскім клубам у першую чаргу трэба распавядаць насельніцтву аб рэгіянальных адметнасцях развіцця фізкультуры і спорту ў іх мясцовасці, зацікавіць спортам, зарыентаваць на арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў такога тыпу.

Рэжысёрам пры стварэнні мастацка-спартыўных свят трэба добра валодаць гісторыяй паходжання спорту і спартыўных свят, выкарыстоўваць народна- і ваенна-спартыўныя гульні і забавы, а таксама займацца актывізацыяй удзельнікаў, распрацоўваць спартыўныя праграмы для ўсіх жадаючых, прыносіць у свята дынамізм, сродак эмацыянальнай разрадкі, а таксама вырашаць праблемы фізічнага выхавання чалавека.

---

1. *Петров, Б. Н.* Массовые спортивно-художественные представления. Основы режиссуры, технологии, организации и методики / Б. Н. Петров. – М. : СпортАкадемПресс, 2001. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Петров, Б. Н.* Спортивно-художественные представления на стадионе / Б. Н. Петров. – Л., 1988. – С. 250.

3. *Сегал, М. Д.* Физкультурные праздники и зрелища / М. Д. Сегал. – М., 1977. – С. 185.

4. *Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ / Ю. М. Черняк. – Минск : ТеатраСистемс, 2004 – 224 с.

***А. К. Демидович,*** *кандидат физико-математических наук, доцент, доцент кафедры информационных технологий в культуре Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# ЭКОНОМИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО МЕНЕДЖМЕНТА

Предлагается подход к анализу социально-культурного менеджмента с использованием понятий эффективности экономики, приоритетов государственных расходов, построения устойчивой рыночной экономики, цифровой трансформации, типов неравенства, поведенческой экономики.

Основой для понимания экономических процессов, происходящих в странах Европы и, в частности, Беларуси, являются отчеты ЕБРР за 2018 г. [7; 8]. В них рассматриваются задачи стран с формирующимся рынком, предлагается ряд рекомендаций по проведению реформ, для необратимости и эффективности которых предлагается придерживаться определенных социальных положений.

Необходимо учитывать и ряд макроэкономических тенденций, которые произошли в мировой экономике за последний цикл развития. За это время преимущественно выросли в процентах от ВВП доля торговли, импорта, сервисов и несколько меньше – правительственные расходы. Наиболее уменьшились доли сельскохозяйственного производства и индустрии (но некоторые области показали рост, триггерные – электроника и информационные технологии). Теперь лидирующими корпорациями фондовых бирж являются информационные компании. Их отчеты указывают на облачные технологии как самый растущий сектор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ